УДК 811.161.3:81’35

У. І. Кулікoвіч, дац., канд. філал. навук;
А. Г. Барашка, дац. канд. тэхн. Навук (БДТУ, г. Мінск)

# МЭТЫ І ЗАДАЧЫ БЕЛАРУСКІХ АРФАГРАФІЧНЫХ МАНАГРАФІЙ

Аб’ектам даследавання сталі дзве манаграфіі, прысвечаныя пытанням беларускай арфаграфіі [1, 2].

Прадметам – мэты і задачы гэтых кніг, адказ на пытанне, як змест другой манаграфіі звязаны са зместам першай, нягледзячы на розныя напрамкі даследавання сістэмы беларускага пісьма.

Манаграфія А. М. Булыкі належыць да філалагічных навук (з’явілася ў 1970 г.) Яе мэта – вывучыць агульную эвалюцыю беларускай графіка-арфаграфічнай сістэмы старажытнага перыяду. Даследаванне В.У. Зелянко – да педагагічных (пабачыла свет у 2016 г.).

Мэта яе – распрацаваць лінгваметадычную сістэму навучання беларускай арфаграфіі з улікам унутрыпрадметных сувязей.

Задачы першай – 1) устанавіць функцыянальную ролю літар для абазначэння галосных і зычных гукаў у старабеларускай пісьменнасці; 2) выявіць спецыфіку арфаграфічнай сістэмы страбеларускай мовы ў яе адносінах да жывога маўлення, г. зн. устанавіць арфаграфічныя нормы, якія грунтаваліся на этымалагічна-марфалагічным прынцыпе, і арфаграфічныя рысы, якія склаліся пад уплывам жывога вымаўлення; 3) апісаць арфаграфічнае значэнне некаторых старажытных палеаграфічных прыёмаў (вынасныя літары, надрадковыя знакі).

Задачы другой – 1) устанавіць напрамкі і прыватнаметадычныя прынцыпы навучання беларускай арфаграфіі; 2) абгрунтаваць неабходнасць уключыць у змест навучання беларускаму правапісу паняццяў арфаграма, арфаграфічнае правіла, арфаграфічная норма; 4) удакладніць структуру арфаграфічнага ўмення (навыку); 5) распрацаваць тыпалогію арфаграфічных практыкаванняў.

На жаль, манаграфічнае даследаванне А.М. Булыкі не пазначана ў спісе літаратуры кнігі В.У. Зелянко. Г. зн. сувязь з гістарычнымі аспектамі фарміравання арфаграфічных правіл і норм не разглядаецца.

## ЛІТАРАТУРА

1. Булыка, А. М. Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы / А. М. Булыка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1970. – 176. С.

2. Зелянко, В. У. Навучанне арфаграфіі беларускай мовы ў 5–11 класах: тэорыя і практыка : манаграфія / В.У. Зелянко. – Мінск: ІВЦ Мінфіна, 2016. – 194 с.